# ВОЙНЫ 1939–1945 гг. У ЛЁСАХ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

***А. А. Яноўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, helgoleg@mail.ru*

На основе различных по характеру и содержанию источников рассматриваются обстоятельства вовлечения коллектива Белорусского государственного университета в Первую мировую, «Зимнюю» и Великую Отечественную войны. Проведен сравнительный анализ некоторых цифровых показателей, доминирующих пропагандистских лозунгов тех лет, но акцентировано внимание на судьбах преподавателей, сотрудников и студентов университета, различным образом приближавших победу.

***Ключевые слова:*** Белорусский государственный университет; военизация; Вторая мировая война; Великая Отечественная война; оккупация; интеллектуалы; фронт и тыл; Минское подполье; сопротивление оккупантам.

# 1939–1945 WARS THROUGH THE FATES OF INTELLECTUALS OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

***A. Yanouski***

*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A.Yanouski (helgoleg@mail.ru)*

The circumstances of the involvement of the staff of the Belarusian State University in the First World War, the Winter War and the Great Patriotic War are considered on the basis of sources of different nature and content. A comparative analysis of some digital indicators, the dominant propaganda slogans of those years, is carried out, but attention is focused on the fate of teachers, staff and students of the university, who in various ways brought the victory closer.

***Key words:*** Belarusian State University; militarization; World War II; Great Patriotic War; occupation; intellectuals; front and rear; Minsk underground; resistance to the invaders.

Тэма распавядання, пазначаная назвай дадзенага матэрыялу, далёка не новая. Аб выкладчыках, супрацоўніках і студэнтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія разам з усім савецкім народам на сваіх плячах вынеслі цяжкія выпрабаванні крывавых Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, напісана не так ужо і мала артыкулаў, брашур, сборнікаў дакументаў і інш. Нават няма неабходнасці рабіць на іх спасылкі, бо даследчыкам яны ў большасці вядомыя. Дадзеная тэма была яшчэ ў сярэдзіне 1970-х гадоў добра адлюстраваная ў экспазіцыі музея гісторыі БДУ, які некалькі адмысловых супрацоўнікаў стварaлі з нулявой адзнакі і ў якім быў афармлены дастаткова разнабаковы тэматычна і насычаны рарытэтнымі экспанатамі спецыяльны раздзел «Універсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны». Аўтар сам прычыніўся да пошуку матэрыялаў і іх экспазіцыйнай падачы. І нават надрукаваў невялікі экскурс па гэтаму раздзелу, каб даць наведавальнікам музея магчымасць больш глыбока асэнсаваць візуальныя і інфармацыйныя дадзеныя спазнання гэтых старонак універсітэцкай гісторыі [21].

Між тым відавочна, што і сёння мы не маем грунтоўнага даследавання тэмы, у якім бы паслядоўна, на падставе вядомых і яшчэ недаступных матэрыялаў (а іх неабходна адшукваць у дзяржаўных і, што найбольш цяжка і карпатліва, у асабістых архівах, уважліва прагледзіць экспазіцыі цэнтральных і мясцовых музеяў, звяртацца да сродкаў масавай інфармацыі і г.д.) былі разгледжаны абставіны ўдзелу такога рознага па свайму складу калектыва БДУ у падзеях 1939–1945 гг. Без сумнення, найбольш прадуктыўным як у навуковым, так і пазнавальна-эмацыянальным сэнсе (а без такога складніка тэксту наўрацці магчыма абыйсціся) можа быць зварот да канкрэтных лёсаў «людзей Універсітэта» у гады войнаў. Няма патрэбы выдумываць нешта новае пры распавяданні аб сотнях лёсаў прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў, асістэнтаў, як і тысяч студэнтаў БДУ. Структура тэксту вызначаецца абставінамі, у якіх дакладна змагаўся за перамогу над жорсткім ворагам увесь савецкі народ і кожны патрыятычна скіраваны чалавек.

У агульным кантэксце – гэта абставіны франтавыя, партызанскія, падполля, тылу. Але пры разглядзе праблемы праз прызму лёсу канкрэтнай асобы вельмі часта прыдзецца распавядаць амаль што пра ўсе гэтыя абставіны разам. Усё ж БДУ, як і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі, у сваім складзе сумяшчаў людзей рознага ўзросту, розных фізічных магчымасцей, рознага менталітэту, нарэшце – рознай падрыхтаванасці да ваеннай справы. Таму разлічваць на іх нейкую татальную мабілізацыю ў дзейнічаю армію не прыходзіцца. Ды такога і не магло быць з-за маланкавага захопу Мінску і ўсёй тэрыторыі Беларусі намецка-фашысцкімі армадамі. Звесткі аб масавым прыходзе на зборныя мабілізацыйныя пункты цяжка падтвердзіць захаваўшыміся крыніцамі. Больш фактаў маецца аб выключна складаных і нярэдка трагічных шляхах эвакуацыі з палаючага Мінску, аб жарсцях жыцця пад акупацыяй, аб змаганні з фашыстамі праз удзел ў падполлі (асабліва Мінскім) і партызанскіх атрадах. Цяпер не могуць заставацца па-за ўвагай даследчыкаў і лёсы тых, хто, па словах акадэміка-гісторыка Мікалая Нікольскага, вымушаны быў «пристроиться» да акупацыйных абставін, каб выжыць проста фізічна, каб пракарміцца. Таму ішлі працаваць на захопнікаў, як пісаў ён, сам спазнаўшы акупацыю, ці то «завхозом», ці «агентом по снабжению», ці «кладовщиком», ці «картотечниками в канцеляриях», ці, як вымушаны быў рабіць першы дэкан універсітэцкага рабфаку Васіль Цёпін, прымяняць свае веды па ўзнаўленню дзейнасці рознага роду вучэбных устаноў на акупіраваных беларускіх тэрыторыях [19, с. 3; 16]. Лёсы гэтых прадстаўнікоў даваеннага калектыву БДУ розныя, яны па-за героікай у яе ўстойлівым афіцыйным і абывацельскім разуменні, але цалкам адпавядаюць тэматыцы «чалавек на вайне». Вось толькі тыя, хто ператварыўся, по словах такого ж М. М. Нікольскага, у «немецких прихлебателей», наўрацці заслугоўваюць увагі ў кантэксце паглыблення ўніверсітэцкай гісторыі тых гадоў...

Ва ўсялякім разе мы някепска навучыліся не заўважаць тое, што не адпавядае ўстаяўшымся велічным парадыгмам-характарыстыкам войнаў 1939–1945 гг. Але не вельмі прасунуліся ў выяўленні не тое што дэталяў, а нават лічбавага пазначэння розных старонак падзей. Тым больш, калі патрэбна спаслацца на канкрэтных людзей, на іх увахожданне ў вайну, іх удзел у вайне, а таксама іх трагічны зыход з вайны пад час яе працягвання. Тут важнымі бачацца

як агульныя колькасныя параметры, так і «дробязь» у параўнанні з маштабамі самой Сусветнай вайны – асоба, чалавек, кожны з якіх не павінен зысці ў нябыт.

Для прыкладу: з публікацыі ў публікацыю з даўняга часу пераходзіць лічба мабілізаваных у першыя дні пасля распачынання Вялікай Айчыннай вайны выкладчыкаў і студэнтаў БДУ – 450 чалавек. Вось толькі не знайсці спасылак, з якіх крыніц ўзятая гэтая лічба, па якой методыцы і кім яна была падлічана. Можна толькі меркаваць, што яна павінна была падкрэсліць факт уключэння ўніверсітэта ва «усенародны адпор ворагу» адразу і ў большасці свайго калектыву. А маштабы БДУ на пачатак 1941 г., калі спаслацца на звесткі, прыведзеныя рэктарам П. П. Савіцкім у сваёй дысертацыі, якая ў 1947 г. была прадстаўлена да абароны ў Маскве, а таксама на лічбы, агучаныя ў матэрыялах, што накіравала кіраўніцтва ўніверсітэта ва ўрад БССР у час падрыхтоўкі да 20-гадовага юбілею БДУ, былі даволі сціплымі. Так, Парфён Пятровіч прывёў агульную лічбу студэнцтва ўсіх ВНУ рэспублікі на канец такога важнага для беларусаў 1939 года – 17425 чалавек (ці на 1 тыс. насельніцтва яшчэ не ўз'яднанай Беларусі – 31 студэнт) [20, с. 27]. Адзіны ўніверсітэт рэспублікі па масштабах быў далёка не першым сярод іншых ВНУ. Наконт колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу ўжо на красавік 1940 г. зусім адназначна праінфарміравалі яшчэ толькі ўваходзячага ў курс спраў старшыню СНК БССР Івана Былінскага (Кабылінскага) (яго афіцыйнае прызначэнне на высокую дзяржаўную пасаду адбудзецца ў чэрвені пасля аўдыенцыі ў Сталіна) не так даўно прызначаныя наркам асветы БССР Еўдакія Уралава і рэктар БДУ Парфён Савіцкі ў адмысловым звароце з просьбай рэалізаваць на ўрадавым узроўні 7 пунктаў прапаноў па адзначэнню 20-годдзя ўніверсітэта як «першай ВНУ ў БССР». Яны падалі наступную інфармацыю: на шасці факультэтах БДУ *«маецца 33 кафедры, на якіх працуе 151 чалавек прафесарска-выкладчыцкага персанала, з іх акадэмікаў 5, дактароў навук і прафесараў 12, кандыдатаў навук і дацэнтаў 41 чал., ст. выкладчыкаў 42, выкладчыкаў 28, асістэнтаў 23, а ўсяго 151 чалавек»* [17, арк. 9].

Колькасць студэнцтва ў гэтым афіцыйным дакуменце, на жаль, не была прыведзена. Ускосныя дадзеныя на гэты конт называлі партыйныя лідары БДУ Цоір і Зальцман (аб іх пакуль што не ўдалося знайсці больш-менш падрабязныя звесткі, хаця верагодна, што Цоір у сярэдзіне 1930-х гг. скончыў фізіка-матэматычны факультэт БДУ. – *Аўт.)* у 24-старонкавай справаздачы «Партарганізацыя за 20 год». Але выніковая лічба і імі не была агучана, хаця вельмі паслядоўна разледжана колькасная і якасная эвалюцыя партарганізацыі з прывядзеннем многіх імёнаў выдатных выпускнікоў і супрацоўнікаў універсітэта. Асабліва цікава сёння ўспрымаецца інфармацыя аб стане «авалодання камуністамі-студэнтамі, навуковымі работнікамі ваеннай спецыяльнасцю»: *«Улічваючы ўсё абвастраючуюся міжнародную абстаноўку і памятаючы ўказанне тав. Сталіна аб неабходнасці трымаць наш народ заўсёды ў стане мабілізацыйнай гатоўнасці, партыйная арганізацыя арганізавала сістэматычны курс ваеннага навучання, абавязковага для ўсіх комуністаў. Два разы ў месяц комуністы і частка беспартыйных абіраюцца і праходзяць вайсковыя заняткі. Гэта сістэма вучобы дапамагае камандзірам запаса быць у курсе справы апошніх дасягненняў ваеннай навукі, а таксама садзейнічае ўзбраенню комуністаў неабходным мінімумам ваенных ведаў»* [17, арк. 22]. У гэтых радках натуральнае жаданне адлюстраваць выключнасць ролі

партыйнай арганізацыі ў пастаноўцы ва ўніверсітэце ваеннай справы, скіраванай на абарону краіны. Між тым ёй займаліся не столькі партыйцы, колькі кадравыя ваенныя ды рэктарат універсітэта.

Калі ж усё-такі завершыць размову аб колькасных маштабах студэцтва БДУ, то грунтуючыся на дадзеных універсітэцкіх справаздач (яны ўтрымліваюцца ў 205-м фондзе Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь), якія прыйшлося параўноўваць з падобнымі іншымі звесткамі, магчыма назваць амаль што дакладную лічбу студэнтаў на канец 1940/1941 вучэбнага года – 1337 чалавек. Да яе патрэбна дадаць 60 (ці, па іншых звестках, 67) аспірантаў БДУ. Так што на пачатак вайны, а гэта 22–25 чэрвеня (улічваючы сітуацыю, якая маланкава развівалася ў Мінску), на мабілізацыйныя пункты горада маглі прыйсці максімальна каля 1,5 тысячы прадстаўнікоў калектыва БДУ. Зразумела, што так не магло адбыцца, прымаючы да ўвагі магчымую колькасць асоб прызыўнога ўзросту і прыгодных да ваеннай справы, а таксама гендэрны стан. Магчыма, такія разважанні і былі прынятыя да ўвагі аўтарамі папярэдніх публікацый, назваўшых 450 чалавек ад БДУ, якія як бы запісаліся ў шэрагі Чырвонай Арміі, а таксама ўвёўшых у зварот публіцыстычную метафару – «Коллектив БГУ объявил себя мобилизованным» [14, с. 5; 15, с. 1].

Дарэчы, такі ж публіцыстычны падыход пры асвятленні падзей чэрвеня 1941 г. характэрны і для першых дзвюх сістэмных кніг па гісторыі БДУ, надрукаваных з нагоды 40 і 50-годдзя ўніверсітэта. І калі ў першай кнізе літаральна караценька, на чатырох абзацах, спачатку падаюцца некалькі лічбаў стану БДУ на чэрвень 1941 г. («150 научных работников», «67 аспирантов»), а потым бездаказальна і не дакладна канстатуецца, што *«В первые же дни Великой Отечественной войны многие преподаватели и студенты ушли в армию с оружием в руках защищать свободу и независимость социалистической Отчизны. Часть преподавателей и студентов ушла в партизанские отряды, часть эвакуировалась в тыл».* Аб удзельніках жа мінскага падполля ні слова! Прозвішчы Яўгена Зубковіча, Анастасія Вязовіча, Рыгора Сагаловіча, Мікалая Сталярова і іншых прадстаўнікоў універсітэцкага калектыву называюцца ўсяго толькі таму, што яны не паспелі эвакуіравацца і былі расстраляныя гітлераўцамі. Іх дачыненне да падполля не пазначана ўвогуле [1, с. 39, 40]. Час ушанавання мінскіх падпольшчыкаў яшчэ не надышоў. Як не дзіўна, але і праз 10 гадоў у новай, больш грунтоўнай кнізе аб гісторыі БДУ, якую ў якасці «редактора-составителя» давёў да выдавецкага гатунку дацэнт-гісторык і былы франтавік-палкоўнік Анатоль Іосіфавіч Кажушкоў, зноў аб ваенных гадах універсітэта не прыбавілася ні новай, ні дакладнай інфармацыі. Толькі пайшлі ў зварот тая ж лічба «450» ды тая ж метафара [2, с. 33].

Між тым, калі зноў звярнуцца да падзей 1939–1941 гг., калектыў БДУ не толькі займаўся сваімі паўсядзённымі справамі, а літаральна рыхтаваўся да вайны. Ваенізацыя акадэмічнага жыцця амаль што 20 гадоў няўхільна мацнела, станавілася паўсядзённасцю ды звыклай часткай разумення прызначэння ўніверсітэта на «заходніх межах СССР». На гэты конт меліся адпаведныя ўрадавыя рашэнні на саюзным і рэспубліканскім узроўнях, якія не раз дапаўняліся на працягу двух дзесяцігоддзяў. У БДУ выкладанне ваенных прадметаў вялося дзесяткамі кадравых афіцэраў (адно імя Г. К. Жукава аб многім гаворыць!), а дачыненне выкладчыкаў да ваеннай справы, патэнцыяльныя магчымасці іх выкарыстання на выпадак вайны ў абавязковым

парадку фіксавалася ў асабістых справах, якія вялі кадравікі. У залікоўках студэнтаў адзнакі аб выніках такой вучобы былі ці не самымі важнымі сярод уласна прафесійных дысцыплін. Аб гэтай старонцы ў гісторыі БДУ аўтар апублікаваў адмысловы артыкул, а зашмат сабранага дакументальнага матэрыялу на гэты конт – падстава для яшчэ не адной публікацыі і нават манаграфіі [22].

Адным словам, БДУ быў падрыхтаваны дастаткова добра да таго, каб на любы выпадак быць мабілізаваным. Але пры ўмове рэалізацыі мабілізацыйнай стратэгіі ў пэўным запланаваным фармаце. Так у большай меры і адбылося с пачаткам Другой сусветнай вайны, калі разгарнуўся «Вызваленчы паход Чырвонай Арміі», а таксама пад час «Зімовай вайны» з Фінляндыяй. Было б з навуковага пункту гледжання прадуктыўнай спроба прасачыць удзел універсітэцкіх супрацоўнікаў і студэнтаў у тых падзеях. Некаторыя факты аператыўна падаваліся на старонка шматтыражкі БДУ «За ленінскія кадры» за 1939–1941 гг. Ужо 16 верасня 1939 г. перадавіца гэтай газеты пад гучнай назвай «Авалодаць ваенная справай» заявіла аб тым, што студэнты «настойліва авалодваюць ваеннымі спецыяльнасцямі, каб пайсці ў слаўную Чырвоную Армію добра падрыхтаванымі да абароны радзімы» і каб зрабіць «наш універсітэт сапраўднай крэпасцю абароны» [3]. А на наступны дзень СССР уступіў у Другую сусветную вайну, што вызначыла пераход ад газетных лозунгаў і заклікаў да рэальнага ўдзелу ў баявых дзеяннях ці, на першы час, у агітацыйна-прапагандысцкіх мерапрыемствах, якія разгарнулі новыя ўлады ў гарадах і вёсках Заходняй Беларусі. Студэнты і выкладчыкі БДУ былі актыўна далучаны да такіх кампаній. Студэнты выступалі з лекцыямі, давалі канцэрты, нават дэманстравалі савецкія ваенныя кінафільмы, раздавалі газеты ды «Кароткі курс ВКП(б)». Універсітэцкая газета напоўнілася матэрыяламі аб гэтым і аб уражаннях непасрэдніых удзельнікаў тых падзей тыпу: *«Надоўга застанецца ў памяці кожнага з нас, байцоў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, якія ўдзельнічалі ў вызваленні працоўных Заходняй Беларусі ад польскага іга, векапомная ноч 17 верасня 1939 года. У 5 гадзін, па загаду камандавання фронта, мы перайшлі дзяржаўную граніцу. Слаўныя чырвоныя палкі пабеданосна пайшлі па братняй зямлі, так багата палітай крывёю і слязьмі працоўных <…>. Як родных, доўгачаканых гасцей, усюды нас сустракала насельніцтва. Вось мы прыйшлі ў мястэчка Радашковічы. На вуліцы вышла амаль усё насельніцтва. На тварах кожнага іскрылася бязмежная радасць…»*. Пад назвамі «Пісьмо з Заходняй Беларусі», «На братняй зямлі ўзышло сонца», «Гатоў да абароны квітнеючай краіны», «Вы з намі, браты-беларусы!», «Адзін народ, адна зямля», «Будзем працаваць яшчэ лепш» і г.д. газета друкавала матэрыялы за подпісамі студэнтаў і выкладчыкаў розных факультэтаў (напрыклад, дэкана гістфака Аляксея П'янкова, прафесара-біёлага Ціхана Годнева, начальніка ваеннай кафедры Гладкага і інш.) [3–9]. Рэфрэнам усіх публікацый была тэза: *«…чэсна і самааддана працаваць на сваіх пастах і гэтым дапамагаць слаўнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі у вызваленні працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад іга панскай Польшчы»* .

Адсочваць такога роду інфармацыю цікава і ў дачыненні падзей вайны з Фінляндыяй. Але пакінем гэта на іншы раз, бо ў фармаце тэмы артыкула немагчыма ахапіць усё. Асобным чынам ваенная праблематыка разглядаецца ў дзесятках нарысаў юбілейнага выдання, якое рыхтуецца да 100-годдзя БДУ.

Ужо пабачылі свет тры кнігі з плануемых да выхаду пяці. І калі ў першай кнізе, дзе прадстаўлены жыццёвыя і творчыя біяграфіі 27 выдатных прадстаўнікоў педагагічна-навуковага калектыву БДУ, ваенны скаладнік прысутнічае толькі ў прадстаўленні 6 універсітэцкіх вучоных (У. І. Пічэта, М. М. Андрэяў, С. З. Кацэнбоген, М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў і, канешне, Г. К. Жукаў), то гэта акалічнасць абумоўлена тым, што ў кнізе пададзены біяграфіі ў значнай ступені тых, хто распачынаў універсітэт і працаваў у ім якраз да 1941 г. [11]. А вось у другой і трэцяй кнігах распавядаецца аб інтэлектуалах БДУ, якія ўвайшлі ў гісторыю ўніверсітэта наступных двух дваццацігоддзяў – да 1961 г. і да 1981 г. [12; 13]. Такім чынам, большасць з іх непасрэдна прычынілася да падзей Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Таму ў другой і трэцяй кнігах 16 і 13, адпаведна, універсітэцкіх выкладчыкаў і студэнтаў, якія ў пасляванны час стануць выкладчыкамі, ці то ваявалі, ці то плённа працавалі ў тыле. Не дзіўна, што большасць з іх набліжала перамогу над ворагам, рэалізуючы свой навукова-педагагічны талент, а не непасрэдна прымаючы ўдзел у ваенных дзеяннях.

Сярод імёнаў многіх дзесяткаў выкладчыкаў і студэнтаў БДУ, якія змагаліся з ворагам на франтах, у партызанскіх атрадах ці падполлі, у юбілейным выданні распавядаецца аб толькі некаторых, бо яго фармат абумоўлены ўсё ж іншым сэнсам – інтэлектуальнае праяўленне місіі Універсітэта. Тым не менш натуральна, што ў час цяжкіх выпрабаванняў і прадстаўнікі па-сапраўднаму «залатога фонду» нацыі не маглі заставацца ў баку ад рашэння першаснай, лёсавызначальнай задачы – адстаяць незалежнасць краіны, зрабіць нават немагчымае, каб атрымаць перамогу над ворагам, вызваліць родную зямлю ад акупантаў. І разам з тым – не страціць накопленыя інтэлектуальныя здабыткі, не даць загінуць ідэі і практыцы Беларускага ўніверсітэта.

Таму Міхась Ларчанка, Пётр Савачкін, Аляксей Сідарэнка, Рыгор Старобінец, Іван Лушчыцкі, Іван Цішчанка, Сцяпан Умрэйка і іншыя намі сёння ўспрымаюцца як франтавікі, ардэнаносцы, прайшоўшыя цяжкія франтавыя дарогі. А вось заснавальнікі ўніверсітэцкага медфаку Міхась Сакалоўскі, Сяргей Мелкіх, Савелій Рубашаў, Аляксандр Ленц, Васіль Леонаў і іншыя ў гады вайны працавалі ў шпіталях, выкладалі ў медыцынскіх інстытутах і акадэміях, паглыблялі тэарэтычныя і практычныя веды ў галіне медыцыны. Лёс некаторых прадстаўнікоў выкладчыцкага корпусу БДУ ў час вайны склаўся зусім незвычайным чынам. Так, прафесар-эканаміст Аляксандр Манаў не змог пакінуць Мінск і застаўся пад акупацыяй, але ў сілу магчымага аказваў супраціў у падполлі. Ён хаваў ад фашыстаў прадстаўнікоў яўрэйскай нацыянальнасці, перажыў зняволенне ў канцлагеры, змог збегчы, а пасля вайны быў узнагароджаны знакам «Праведнік народаў свету». Яго калегі прафесар-гісторык Мікалай Нікольскі і прафесар-хімік Фама Асіпенка таксама мелі дачыненне да мінскага падполля. Першы, Мікалай Міхайлавіч, потым напісаў выдатныя ўспаміны, якія былі праз гады дапоўнены і ўдакладнены яго жонкай, дацэнтам гістфака Рахіллю Абрамаўнай [19; 18]. Кожную старонку хацелася б працытаваць, так як там утрымліваюцца важныя падрабязнасці аб жыцці абодвух пад акупацыяй, аб імкненні сваімі дзеяннямі хоць крыху праблізіць перамогу над акупантамі. Але зноў жа – тут толькі зробім пазначэнні такой магчымасці.

Зразумела, у тых суровых абставінах было мала імкнення фіксаваць на паперы свае перажыванні, свае імкненні, а тым больш свой паўсядзённы побыт. Пад акупацыяй патрэбна было не проста выжываць, але ў меру магчымага спрыяць набліжэнню перамогі. І калі аб самых высокародных і гаротных старонках лёсаў прафесара-біёлага БДУ Яўгена Зубковіча, яго калег – дацэнта Анастасія Вязовіча і аспіранткі Зінаіды Завістовіч – можна даведацца з невялікіх успамінаў Мсціслава Яўгенавіча Зубковіча – сына Я. М. Зубковіча [10], то гады пад акупацыяй у Мінску і змаганне з ворагам, што выпалі на жыццё прафесара-матэматыка Мікалая Сталярова і іншых выкладчыкаў і студэнтаў БДУ, аказаўшыхся ў зоне акупацыі, і сёння «прачытваюцца» толькі па ўскосных дадзеных. Вядома, што іх схапілі і расстралялі фашысты літаральна за некалькі дзён да вызвалення Мінска.

Немалы фактычны матэрыял, які за многія гады работы над узнаўленнем гісторыі БДУ накапіўся ў асабістым архіве аўтара, дазваляе ўспрымаць, асэнсоўваць і ацэньваць таксама розныя «колабегі» лёсаў прадстаўнікоў яго калектыву, спрабаваць зразумець ўчынкі людзей-інтэлектуалаў, якія вымушаны былі рабіць свой выбар у экстрэмальных сітуацыях. А такімі экстрымамі для жыцця і прафесійнай дзейнасці стаў, як аказалася, не толькі жудасны час савецкіх рэпрэсій, а і час змагання з фашысцкай навалай. Пражыць скарыўшыся ў першым выпадку было магчымым, хаця бліжэйшая будучыня зусім не гарантавалася… А вось пакорлівасць перад знешнім ворагам ніякім чынам не магла стаць жыццёвым выбарам для любога чалавека, які быў выхаваны на прыкладах першаснасці аховы і зберажэння сваёй радзімы перад любым знешнім ворагам.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина. Минск : Изд-во МВССПО БССР, 1962. 278 с.
2. Белорусский ордена Трудового Красного Знамени государственный университет имени В. И. Ленина. Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1971. 319 с.
3. За ленінскія кадры. 1939. 16 верасня.
4. За ленінскія кадры. 1939. 29 верасня.
5. За ленінскія кадры. 23 кастрычніка.
6. За ленінскія кадры. 29 кастрычніка.
7. За ленінскія кадры. 30 лістапада.
8. За ленінскія кадры. 14 снежня.
9. За ленінскія кадры. 21 снежня.
10. Зубкович М. Е. Воспоминания об отце. 20.02.1971 г. // Асабісты архіў аўтара. С. 1–11.
11. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941); науч. ред. О. А. Яновский. Минск : БГУ, 2017. 303 с.
12. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1961); науч. ред. О. А. Яновский. Минск : БГУ, 2019. 333 с.
13. Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941); науч. ред. О. А. Яновский. Минск : БГУ, 2020. 303 с.
14. Кожушков А. И., Чудаев М. Ф. За честь и независимость родины (Участие преподавателей и студентов БГУ в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны) // Веснік БДУ імя У. І. Леніна. Серыя ІІІ. 1984. № 2.
15. Кожушков А. И., Чудаев М. Ф. Белорусский государственный университет имени В. И. Ленина в годы Великой Отечественной войны. Минск : БГУ, 1984. 19 с.

16. Малюгин О. И., Яновский О. А. Василий Павлович Тёпин и его «История Белорусского государственного университета» // Журнал Белорусского государственного университета. История. 2019. № 4. С. 82–94.
17. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 205. Воп. 1. Спр.751.
18. Никольская Р. А. Воспоминания. 31.07.2000 г. // Асабісты архіў аўтара. С. 1–34.
19. Никольский Н. М. Как мы пришли к партизанам // Рукописный журнал «Партизан Отечественной войны» за февраль 1944 г. партизанского отряда С. Г. Лазо бригады «За Советскую Белоруссию» Минской области // Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ф. кп. 13264. Л. 7–20.
20. Савицкий П. П. Оккупационный режим немецких захватчиков в Белоруссии (1941–1944 гг.). Дисс. на соискание уч. степ. канд. ист. наук. М., 1947. 254 с.
21. Яновский О. А. Тема Великой Отечественной войны в экспозиции музея истории Белорусского государственного университета имени В. И. Ленина // Героические события Великой Отечественной войны в памятниках и обелисках Родины и их роль в военно-патриотическом воспитании молодежи: Тезисы межвуз. науч.-практ. конф. Минск : «Полымя», 1983. С. 30–32.
22. Яноўскі А. «На любы заклік – наш цьвёрды адказ: “Заўсёды гатовы!”». Ваенная справа і фізкультура ў падрыхтоўцы беларускіх студэнтаў 1920-х – пачатку 1930-х гадоў // Беларуская думка. 2019. № 11. С. 78–85.